В последнее время возросло количество студентов, числящихся в составе кастинговых агенств. Зарплата модели составляет около 65-120 евро в день. Если же студент реализует себя как фотомодель, его заработок колеблется между 150 и 230 евро за серию фотографий в день.

По статистике, примерно 30 % студентов работают в летнее время, 35 – одновременно и летом, и в период учебы, и только 15 % зарабатывают деньги в течение года. Средняя продолжительность работы – от 1 до 5 дней в неделю.

Свое свободное время французские студенты стараются организовать как можно более интересным образом. Инициатива молодежи поощряется в форме субсидий, и студенческие культурные проекты имеют все шансы развиваться: по типу выставок, экспедиций, различных кампаний, встреч. Область культурной деятельности достаточно широка: театр, танцы, кино, аудиовизуальные средства, музыка, скульптура, фотография, изобразительное искусство. Национальные конкурсы являются стимулом для развития культурной деятельности студентов, например, в таких сферах как фотография, письмо, графическое искусство.

Вчерашние школьники, становясь студентами французских вузов, в полной мере обеспечивают себя всесторонней помощью Национального центра университетских организаций CROUS.

## ЭВАЛЮЦЫЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ Ў СВЕЦЕ

http://edoc.bseu.by

*Н. Шастаковіч*
*Пінскі філіял*
*Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта*

У працэсе нармальнага функцыяніравання і развіцця грамадства выключна важную ролю адыгрывае грамадскі інстытут адукацыі.

Матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, веды, вопыт, традыцыі, якія былі назапашаны працай папярэдніх пакаленняў, павінны быць перададзены новаму пакаленню людзей і засвоены імі. Таму падтрымка дасягнутага ўзроўню культурнага развіцця, яго далейшае ўдасканаленне немагчыма без авалодвання культурнай спадчынай мінулых стагоддзяў. Гэта праблема вырашаецца ў працэсе сацыялізацыі індывідуума, задачай якой з`яўляецца далучэнне чалавека да норм і каштоўнасцяў культуры, а таксама пераўтварэнне яго ў паўнапраўнага члена грамадства.

Істотным кампанентам працэсу сацыялізацыі індывідуума выступае адукацыя – навучанне чалавека з мэтай перадачы назапашаных каштоўнасцяў. Больш падрабязна адукацыю можна ахарактарызаваць, як адносна самастойную сістэму, функцыяй якой з`яуляецца сістэматычнае навучанне і выхаванне членаў грамадства, якое арыентавана на авалодванне вызначанымі ведамі, ідэйна-матэрыяльнымі каштоўнасцямі, уменнем, нормамі паводзін, утрыманне якіх вызначаецца грамадска-эканамічным і палітычным ладам грамадства, узроўнем яго матэрыяльна-тэхнічнага развіцця.

У першабытных грамадствах выхаванне з'яўлялася важнай часткай грамадскага працэсу. У тыя далекія часы не існавала ні школ, ні настаўнікаў. У перадачы культурнай спадчыны, вопыту, ведаў, традыцый удзельнічалі ўсе члены грамадства. У жыцці падрастаючага пакалення не існавала і спецыяльнага перыяду падрыхтоўкі для засвойвання грамадскіх роляў дарослых, бо ўсе неабходныя веды, навыкі і здольнасці набываліся і развіваліся пад час непасрэднага далучэння дзяцей да практычных спраў племені. Характэрна таксама тое, што далучэнне дзяцей да працоўнай дзейнасці, навучання прафесійным навыкам пачыналася з 4-5 год, а ў падлеткавым узросце дзеці аднолькава з дарослымі ўдзельнічалі ў паляванні і рыбнай лоўлі, пасвілі жывел, выраблялі прылады працы, удзельнічалі ў прыгатаванні ежы. Выхаваннем і навучаннем хлопчыкаў займаліся мужчыны, дзяўчынак – жанчыны. Калі дзіця падрастала, яно падвяргалася асобай цырымоніі «ініцыяцыі», якая працягвалася некалькі дзен, пад час якіх юнакі і дзяўчаты павінны былі прадэманстраваць і падцвердзіць свае здольнасці і правы дарослых членаў грамадста, для гэтага яны ўдзельнічалі ў спаборніцтвах, танцах, абрадах і культавых дзеях.

У даіндустрыяльным грамадстве разам з пашырэннем грамадскага падзела працы, з'яўленнем дзяржаўнай улады і саслоўнай няроўнасці, пачынаецца адасабленне інстытута адукацыі. Сацыяльную падрыхтоўку і навучанне з выкарыстаннем асаблівай групы настаўнікаў атрымліваюць дзеці багатых сямей. Наглядным прыкладам першых фармальных сістэм навучання могуць служыць школы Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, у якіх платныя настаўнікі навучалі дзяцей высакародных саслоўяў граматыцы, філасофіі, музыцы, спорту, красамоўству, асновам юрыспрудэнцыі, медыцыне і інш. Навучанне дзяцей з іншых саслоўяў ажыццяўлялася ў працэсе вучнеўства, калі падлетка на вызначаны тэрмін аддавалі на вучобу ў дом гандляра, купца, рамесніка. Працуючы ў якасці падмастэр'я, вучань авалодваў прафесійнымі ведамі і навыкамі, мастацтвам гандлю, рамяства. Пераважная частка насельніцтва – сялянства – навучала сваіх дзяцей, перадаючы ім веды ў час сялянска-гаспадарчага працэсу. Важная роля ў выхаванні дзяцей належыла сям'і.

У эпоху Сярэднявечча пачынае складацца больш арганізаваная сістэма адукацыі, калі хрысціянская царква стварае ў Еўропе сетку спецыяльных вучэбных устаноў па падрыхтоўцы асоб з духоўнымі званнямі, і ўзнікаюць першыя універсітэты ў Парыжы, Оксфардзе і іншых гарадах. Трошкі пазней культурна-адукацыйныя функцыі універсітэтаў пашырыліся, у іх пачынаюць навучаць медыцыне і юрыспрудэнцыі, распачынаюцца першыя спробы навуковых даследаванняў у галіне фізікі, матэматыцы, логікі.

Характэрнай асаблівасцю сістэмы адукацыі ў даіндустрыяльным грамадстве з'яўлялася тое, што яна была даступнай для абмежаванага кола асоб, выхадцаў з багатых і прэстыжных саслоўяў. Сапраўдная рэвалюцыя ў сістэме адукацыі здзейснілася ў грамадстве індустрыяльнага тыпу: адукацыя перастае быць элітарнай і становіцца масавай і даступнай для шырокага кола насельніцтва. Такая радыкальная трансфармацыя інстытута адукацыі была выклікана патрабаваннямі эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, змяненнямі ў культуры і вобразе жыцця людзей.

У XIX-XX ст.ст. распаўсюджанне атрымалі сярэднія і спецыяльныя школы, ішоў рост вышэйшых устаноў. Няпоўная, а затым і поўная сярэдняя адукацыя становіцца неабходнай умовай атрымання прафесіі ў галінах прамысловасці. Асабліва буйны рост сістэмы адукацыі даводзіцца на перыяд пасля другой сусветнай вайны, калі адбываецца тэхнічнае пераўзбраенне вядучых індустрыяльных краін і новы магутны скачок у развіцці прамысловасці, навукі, тэхнікі. Хутка расце сетка вышэйшых навучальных устаноў: інстытутаў, каледжаў, універсітэтаў, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Так, у былым СССР налічвалася каля 1000 ВНУ, у якіх навучалася каля 5 млн чалавек, і штогод выпускалася каля 800 тыс. спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

Найбольш уражваючых маштабаў дасягнула развіцце сістэмы вышэйшай адукацыі ў ЗША, дзе агульная колькасць студэнтаў дасягнула 25,5 млн чалавек, з іх 8 млн вучыцца ў вышэйшай школе, а 4,5 – у двухгадовых каледжах.

Не толькі масавасць, але і агульнадаступнасць харктарызуюць сучасную сістэму адукацыі. Акрамя таго, яна адрозніваецца чаргой якасна новых уласцівасцяў: калі ў даіндустрыяльным грамадстве сістэма адукацыі была арыентавана галоўным чынам на захаванне і аднаўленне культуры, вопыту і ведаў папярэдніх пакаленняў, то ў сучасным грамадстве інстытут адукацыі становіцца важнейшым фактарам культурнага і сацыяльнага змянення і развіцця.

Другую палову XX ст. невыпадкова называюць эпохай культурнай і адукацыйнай рэвалюцыі па той прычыне, што сістэма адукацыі ставілася ключавым фактарам грамадскага прагрэсу.

Ва ўсіх прамыслова развітых краінах свету перыяд 60-80-х гг. адзначаўся буйнымі рэформамі ў сістэме адукацыі, задача якіх – павышэнне яе эфектыўнасці, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы на аснове новых інфармацыйных тэхналогій і гуманізацыі адукацыйнага працэсу. Найбольш істотнымі асаблівасцямі сучаснай сістэмы адукацыі з'яўляюцца наступныя моманты: пераўтварэнне яе ў шматступенчатую сістэму, якая дазваляе чалавеку паляпшаць і аднаўляць атрыманыя раней веды і навыкі.

## ЖИЗНЬ СТУДЕНТОВ В ШОТЛАНДИИ

***О. Шишко***
*Пинский филиал*
*Белорусского государственного экономического университета*

Глазго – это не Англия, это – Шотландия. И почувствовать то, что ты не в Англии, а именно в Шотландии, довольно легко.

Мужчины в юбках – главный стереотип – по улицам действительно ходят: национальная символика в Шотландии в почете. Нельзя сказать, что все мужчины одеваются только так, но те, кто носит народную одежду, носят ее с гордостью. Вообще, первое, что бросается в глаза в Шотландии – это то, что люди, как правило, одеваются очень легко по нашим понятиям. Уже по утрам примо-